ПАТОМНЫ ВЯСКОВЕЦ — ДВОЙЧЫ СТАРАСТА

МС

НАРОД АБ СВАІМ ЖЫЦЦІ

13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

21 ЖНІЎНЯ 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 162 (29276)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл ОРДА, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі:

«Складаныя, цяжкія два дні — гэта тое, што адбывалася 9 і 10 жніўня. Федэрацыя прафсаюзаў звярнулася да праваахоўных органаў. У нашым звароце гаворыцца пра тое, што сёння неабходна дэталёва і аб'ектыўна вывучыць кожны выпадак. Міністр унутраных спраў на днях зрабіў заяву аб тым, што ўсе выпадкі будуць вывучаны і ўжо прыступілі да іх вывучэння. І я думаю, што ў найбліжэйшы час мы пачуем вынікі гэтага расследавання. Але нам трэба зрабіць усё, каб больш ніколі ў нас не паўтарылася тое, што адбылося. І неабходна з кожным выпадкам разабрацца і даць аб'ектыўную ацэнку. У нас ёсць прававая інспекцыя, там працуюць высакакласныя юрысты, і мы гатовыя аказаць пацярпелым прававое суправаджэнне. Прычым не важна, ваходзіць чалавек у рады прафсаюза ці не».

«Салодкае жыццё» Пятровіча

Былы настаўнік матэматыкі і фізікі, жыхар вёскі Стралкі Верхнядзвінскага раёна Пётр КАСЬКОВІЧ амаль паўстагоддзя займаецца любімай справай — пчалярствам. У свой час ён быў першапраходцам сярод вяскоўцаў, якія распачналі гэты клапатлівы і захапляльны мядовы занятак. Для многіх вяскоўцаў-пчаляроў Пётр Пятровіч быў і застаецца першым настаўнікам — перадае ім свае мядова-пчалярскія навыкі і досвед.

— Цяпер у мяне засталося толькі шаснаццаць вулейчыкаў (раней было сорак), але і з гэтай колькасцю пчоласем'яў хапае турбот — як-ніяк, мне ўжо пад восемдзесят, — з лёгкім сумам кажа Пётр Каськовіч. — Хачу, каб салодкім рамяством авалодаў і мой унук Уладзіслаў — вядома, яго таксама навучу, як займацца пчоламі.

Наведаўшы вёску Стралкі і сустрэўшыся з Пятром Пятровічам, я пазнаёміўся і з яго ўнукам Уладзіславам ФЕДУКОВІЧАМ, які жыве ў райцэнтры і працуе выконваючым абавязкі галоўнага інжынера прадпрыемства электрасетак Верхнядзвінскага раёна. А яшчэ даведаўся, што настаўнік і пчаляр Каськовіч па-ранейшаму сябруе са «Звяздою» — ужо на працягу трыццаці гадоў.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

КАРАТКА

- **У студзені—ліпені праз БУТБ прадалі ў 4 разы больш сырога малака, чым за ўвесь 2019 год.**
- «Белавія» працягнула прыпыненне рэйсаў у Грузію да канца верасня.
- **Тэмпература вады ў рэках Беларусі складае плюс 14—23 градусы.**
- Авіяцыя МНС працягвае аказваць дапамогу ў тушэнні лясных пажараў у Турцыі.
- **Фрагменты бліндажа і астанкі чырвонаармейцаў знайшлі ў Віцебскім раёне.**

ISSN 1990 - 763X

Энергетыка

Ядзернае паліва на БелАЭС загружана

Атамшчыкі рыхтуюцца да «халодных» выпрабаванняў

Сусветная практыка паказвае, што энергаблоку, каб ён запрацаваў, патрэбна дзесяць гадоў: ад моманту стварэння да запуску. Будаўніцтва Беларускай АЭС у гэтым плане ідзе хіба што не з апераджэннем графіка. Энергетычны пуск першага рэактара з уключэннем у беларускую энергасістэму запланаваны сёлета на чацвёрты квартал. Пра спецыфіку нагляду і ліцэнзавання Беларускай АЭС на этапах фізічнага і энергетычнага пуску расказалі эксперты Дзяржатамнагляда.

Дзейнасць у галіне выкарыстання атамнай энергіі ліцэнзуецца, гэтаксама як і ўсе этапы жыццёвага цыклу існавання ядзернай установкі. Гэта азначае, што перш чым дазволіць станцыі запрацаваць, эксплуатуючая арганізацыя, якая атрымлівае адпаведнае рашэнне, павінна прадставіць камплект дакументаў ліцэнзуючаму органу. У Беларусі гэта Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. А разглядае дакументы, праводзіць экспертызу і прымае рашэнне аб дазволе на дзейнасць Дзяржатамнагляд, абазначыла **Вольга ЛУГАЎСКАЯ, начальнік Дэпартамента па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях (Дзяржатамнагляда).**

СТАР. 2

Надвор'е

ДАЖДЖЫ ВОЗЬМУЦЬ ПАЎЗУ. АЛЕ НЕНАДОЎГА

Доўгачаканыя дажджы, нарэшце, прыйшлі на гэтым тыдні. Але, на жаль, пакуль што яны не насычылі зямлю вадой так, як бы гэтага хацелася. Па звестках Міністэрства лясной гаспадаркі, зараз устаноўлены забароны і абмежаванні на наведванне лясоў у 34 раёнах Беларусі. Пры гэтым у «чырвонай зоне» — уся Гомельская вобласць. Рэшта ж знаходзіцца ўздоўж межаў з краінамі Балтыі.

Ці палепшыцца сітуацыя ў іх? Падрабязней пра надвор'е на канец тыдня расказалі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

З суботы антыцыклон распаўсюдзіцца на ўсю тэрыторыю Беларусі. У суботу адыходзячае лета ласкава нас пагрэе. Удзень будзе +22—29! Праўда, уначы ўжо адаб'ецца блізкасць верасня — чакаецца ўсяго ад сямі да чатырнаццаці са знакам «плюс». Абыдзецца без ападкаў. Вецер мяркуецца ўмераны, але няўстойлівы.

23 жніўня надвор'е зноў пачне пакрысе змяняцца. На тэрыторыю Беларусі пачне змяшчацца франтальны раздзел. Пачынаючы з паўночнага захаду, будзе павялічвацца воблачнасць. Адтуль жа да нас прыйдуць кароткачасовыя дажджы. Але халадна не будзе — ад 21 да 27 цяпла, месцамі сонца паспее нагрэць паветра да 29 вышэй за нуль. Уначы ж тэмпература не зменіцца ў параўнанні з суботай, за адным выключэннем — на захадзе яна можа дасягаць 15—18 цяпла. Абумоўлена гэта большай колькасцю аблокаў.

Па папярэдніх прагнозах, дажджы на большую частку тэрыторыі краіны вернуцца ў пачатку наступнага тыдня.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Ва ўрадзе

Уладзімір МАКЕЙ:

«УСЕ МЫ ЗА ТОЕ, ШТО НАЗЫВАЕЦЦА ЁМІСТЫМ БЕЛАРУСКІМ СЛОВАМ «ЛЮДСКАСЦЬ»

Міністр замежных спраў звярнуўся да беларускіх дыпламатаў

«Шаноўныя калегі! Заўсёды ганарыўся і буду ганарыцца калектывам Міністэрства замежных спраў нашай краіны, усёй сістэмай дыпламатычнай службы Рэспублікі Беларусь. Можа быць, за чвэрць стагоддзя нам не ўдалося дасягнуць галавакружных поспехаў, але беларуская дыпламатыя сапраўды ніколі не рабіла таго, за што можа быць сорамна», — сказана ў звароце.

Міністр назваў сённяшнюю сітуацыю ў краіне самым складаным этапам яе найноўшай гісторыі.

«Гаворка на самай справе ідзе аб захаванні дзяржаўнасці, — лічыць ён. — ...Гэтыя падзеі не могуць пакінуць нікога з нас абыякавымі таму, што мы падзяляем агульначалавечыя, нашы беларускія, каштоўнасці, выступаем за адзінства нацыі, не прымаем радыкалізм і неапраўданы гвалт. Усе мы за тое, што называецца ёмістым беларускім словам «людскасць».

Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства закрануў тэму пагроз на адрас дзяржаўных служачых і іх сем'яў. «За гэтыя слёзы майго адзінаццацігадовага сына я гатовы перагрызці горла. Дэмакратыяй тут не пахне. Тут смярдзіць пагромамі і расправамі, — напісаў ён. — Адзінкі, напэўна, спасуюць. Але ў цэлым «дзякуй» тым, хто запалохвае, таму што такія дзеянні сцэментуюць нас — тых, хто сапраўды хацеў бы дабра Радзіме».

Уладзімір Макей падкрэсліў, што кожны мае права на эмоцыі, грамадзянскую і чалавечую пазіцыю. «Без гарачага сэрца ў нашай прафесіі ніяк. Але і без цвярозага погляду на сітуацыю таксама, — дадаў ён. — Частка нашай работы — ствараць і дасягаць згоды».

Ён заклікаў дыпламатаў не забываць сваё прафесійнае пакліканне, не ўносіць раскол у калектыў міністэрства, не ўступаць у здзелку з сумленнем і не ісці слепа за масамі.

«Перамены патрэбныя, гэтага ніхто не адмаўляе, — дадаў міністр. — Але не за кошт грамадзянскага супрацьстаяння ці рэвалюцый. У гэтым выпадку ахвяр і негатыўных наступстваў будзе ў разы больш. Мы ўжо адкінутыя на шмат гадоў у нашым развіцці з-за падзей апошніх дзён. Але ж нашы людзі, наша краіна гэтага не заслугоўваюць».

Уладзімір Макей упэўнены: хай і павольны, але эвалюцыйны працэс у канчатковым выніку заўсёды аказваецца больш эфектыўным.

«Мы вартыя лепшага, дзе кожны адзін для аднаго чалавек, зямляк, партнёр і цэлы свет, а не «чырвоны» ці «белы». Мы праходзім балючы этап станаўлення незалежнай дзяржавы, выспявання грамадзянскай супольнасці. Заўсёды аналізуйце сітуацыю. Гэта складана пры такім інфармацыйным патоку, але вы гэта ўмееце, — упэўнены кіраўнік ведамства. — У гэты лёсавызначальны для нашай краіны момант як ніколі важна адстойваць знешнепалітычныя інтарэсы Беларусі. Яны нязменныя, яны былі, ёсць і нікуды не сыдуць. Таму без эмоцый адкажыце сабе на пытанне: я ўсё яшчэ магу прынесці карысць краіне на сваім участку работы? Я на гэта пытанне сабе адказаў, бо не хачу страціць сваю краіну. Калі ў вас адказ станоўчы, адкіньце сумневы і давайце працягваць адказна рабіць сваю справу! Магчыма, менавіта да гэтага моманту гісторыі вас рыхтаваў лёс!»

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Ядзернае паліва на БелАЭС загружана

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— На пачатку жніўня на станцыі пачаўся першы этап фізічнага пуску — загрузка свежага ядзернага паліва ў рэактарную ўстаноўку. На тым этапе, на які выдадзены дазвол, будуць яшчэ ажыццяўляцца працэдуры, звязаныя са зборкай рэактара. Цяпер АЭС працуе ў межах ліцэнзіі на стварэнне і ў межах ліцэнзіі на абыходжанне з палівам. А ўвогуле працэс экспертызы і разгляду дакументаў вельмі працяглы. Пачаўся ён яшчэ ў 2017-м, калі АЭС падала камплект дакументаў на атрыманне адпаведнага дазволу.

Напрыклад, камплект дакументаў, які вызначае бяспеку, уключае ў сябе справаздачу аб абгрунтаванні бяспекі, праграму якасці, неабходныя тэхрэгламенты і іншае. Пасля разгляду гэтых шматтомных дакументаў экспертная арганізацыя дасць заключэнне аб адпаведнасці ўсіх рэалізуемых праектных рашэнняў і гатоўнасці самой станцыі выконваюць сваю функцыю.

— Наступны этап, які дазваляе нам вынесці комплекснае рашэнне аб магчымасці выдаць такі дазвол, — гэта ацэнка адпаведнасці. Разглядаюцца дакументы, што прадстаўляе АЭС, якія сведчаць, у прыватнасці, аб гатоўнасці эксплуатуючай арганізацыі выконваць адпаведныя работы. А таксама вынікі мэтавай інспекцыі, якая разглядае фізічную гатоўнасць аб'екта, выкананне ўсіх патрабаванняў на пляцоўцы, праводзіць тэхкантроль, сумоўі з кіраўнікамі эксплуатуючай арганізацыі. Такім чынам выносіцца другое заключэнне, якое датычыцца ўжо непасрэдна пляцоўкі станцыі. На падставе гэтых двух разглядаў выносіцца агульнае рашэнне аб магчымасці выдачы АЭС адпаведнага дазволу.

Увод першага блока АЭС у эксплуатацыю — самы важны этап у стварэнні станцыі, які цяпер ужо ажыццяўляецца на пляцоўцы. Першы з чатырох яго складальнікаў — паэтапныя выпрабаванні і апрабаванне сістэм і абсталявання на іх адпаведнасць праектным параметрам без ядзернага паліва. Другі — фізічны пуск, які ўяўляе сабой тыя ж выпрабаванні, але ўжо пры загружаным у рэактар паліве. Трэці — энергетычны пуск — уключэнне турбаўстаноўкі і адпаведныя выпрабаванні. Чацвёрты — вопытна-прамысловая эксплуатацыя — комплекснае апрабаванне ўсяго абсталявання, расказаў **Віген МАРУХЯН, начальнік упраўлення рэгулявання ядзернай бяспекі Дзяржатамнагляда:**

— Этап фізічнага пуску падзелены на тры фазы: загрузка паліва ў рэактар, «халодныя» гідраўлічныя выпрабаванні пры тэмпературы ядзернай установкі да 130 °С і «гарачае» выпрабаванне пры падключаным абсталяванні і тэмпературай цепланосьбітаў, якая можа падымацца да 180 °С. Аднак пры ўсім гэтым не будзе праводзіцца цеплаадвод, бо ўсе рэгулюючыя стрыжні апушчаны ў ніз рэактарнай установкі і працэс цеплаабмену не адбываецца.

Заканадаўствам на пляцоўцы стварэння БелАЭС устаноўлены рэжым пастаяннага нагляду. Кантрольна-наглядныя мерапрыемствы праводзяцца там па асобным заканадаўчым акце, а Дзяржатамнагляд размясціў уласны аддзел з шасцю рабочымі месцамі, расказаў пра асаблівасці этапаў уводу Беларускай АЭС у эксплуатацыю **Максім МАЗУРЭНКА, начальнік упраўлення арганізацыі нагляду за ядзернай і радыяцыйнай бяспекай ядзерных установак Дзяржатамнагляда:**

— Адна з асаблівасцяў існуе ў плане арганізацыі праверак. Перад кожным этапам праводзіцца мэтавая праверка ацэнкі гатоўнасці пляцоўкі да яго пачатку. Падчас ходу этапу таксама ідуць праверкі. Спецыфіка ў тым, што шмат намаганняў аддаецца прафілактычнай рабоце. Мы таксама задзейнічаем нашы арганізацыі тэхнічнай падтрымкі, каб у нашых інспектараў была нейкая экспертная падтрымка. І яшчэ адна спецыфіка — значны дакументаабарот.

Цяпер на станцыі завершана першая фаза фізічнага пуску (загружана ядзернае паліва), другая пачнецца, калі АЭС дашле ў Дзяржатамнагляд паведамленне аб сваёй гатоўнасці да гідраўлічных выпрабаванняў.

Ірына СІДАРОК.

У тэму

З 17 да 19 жніўня эксперты Маскоўскага цэнтра Сусветнай асацыяцыі арганізацый (САА АЭС), якія эксплуатуюць атамныя электрастанцыі, правялі партнёрскую перадпускавую праверку першага энергаблока БелАЭС, паведаміла **прэс-сакратар Мінэнерга Вольга КАЗЛОВІЧ**:

— Праверка праводзілася па найбольш важных кірунках вытворчай дзейнасці эксплуатуючай арганізацыі для ацэнкі гатоўнасці абсталявання і сістэм энергаблока да бяспечнага пуску і далейшай эксплуатацыі.

Эксперты не выявілі недахопаў, якія маглі б стаць перашкодай для пуску. Спецыялісты САА АЭС адзначылі значны прагрэс у арганізацыі дзейнасці АЭС па забеспячэнні і кантролі належнага стану абсталявання і сістэм, важных для бяспекі, а таксама паляпшэнне па ўсіх праверэных кірунках вытворчай дзейнасці.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ЗША практычна вывелі войскі з Ірака

Злучаныя Штаты Амерыкі ў асноўным выйшлі з Ірака. Пра гэта заявіў 19 жніўня на прэс-канферэнцыі прэзідэнт ЗША Дональд Трамп, паведамляе ТАСС.

«Мы ў асноўным выйшлі з Ірака, пакінулі там вельмі мала ваеннаслужачых. Мы скончым гэтыя бясконцыя войны, недарэчныя бясконцыя войны. Гэта было найгоршае рашэнне ў гісторыі нашай краіны». На думку прэзідэнта ЗША, амерыканскіх ваенных ніколі не павінна было быць на Блізкім Усходзе.

«Але мы выходзім вельмі хутка, за тры гады», — адзначыў Дональд Трамп, затым перайшоў да тэмы прысутнасці ў Афганістане. Кіраўнік Белага дома падкрэсліў, што ў ЗША вельмі добра ідуць перамовы з Афганістанам. «Мы знізілі прысутнасць да вельмі невялікага ўзроўню. Дзейнічаем там як паліцыя ўжо 19 гадоў. Час нашым салдатам вяртацца дадому», — дадаў ён.

Як заявіў 8 жніўня тэлеканалу Fox News кіраўнік Пентагона Марк Эспер, ЗША да канца лістапада маюць намер скараціць ваенны кантынгент у Афганістане да менш чым пяці тысяч чалавек. У сваю чаргу лідар Злучаных Штатаў нагадаў, што ўвосень 2019 года вывеў кантынгент з раёна турэцка-сірыйскай мяжы: «Турцыя сама можа паклапаціцца пра сябе». У чэрвені ў сумеснай заяве ўлад ЗША і Ірака па выніках перамоў у рамках распачатага паміж імі стратэгічнага дыялогу гаварылася пра тое, што Вашынгтон у найбліжэйшыя месяцы працягне скарачаць сваю ваенную прысутнасць у Іраку і будзе абмяркоўваць з Багдадам статус амерыканскіх ваеннаслужачых, што засталіся ў краіне.

Прэзідэнт Францыі выключае магчымасць паўторнага ўвядзення каранціну па ўсёй краіне

Прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон лічыць недапушчальным з эканамічных прычын паўторнае ўвядзенне ў краіне каранціну з-за каранавіруса. Пра гэта ён заявіў у інтэрв'ю, апублікаваным у часопісе Paris Match, паведамляе ТАСС. «Немагчыма паўторна спыніць усё ў Францыі. Таму што спадарожныя страты такога каранціну будуць вельмі буйныя», — сказаў прэзідэнт. Пры гэтым ён выказаў меркаванне, што, незалежна ад мер, нулявой рызыкі распаўсюджвання віруса чакаць немагчыма.

«У выпадку, калі сітуацыя гэтага запатрабуе, мы не выключаем мэтавага лакальнага ўвядзення каранціну», — удакладніў Эмануэль Макрон.

Таксама Макрон адзначыў важнасць працягу тэсціравання насельніцтва на каранавірус, выяўленне новых ачагоў захворвання. «Калі гэта будзе неабходна, мы пашырым практыку нашэння масак», — сказаў французскі лідар.

Тайланд узначаліў рэйтынг самых бяспечных напрамкаў для падарожжаў

Паводле даследавання нямецкай турыстычнай кампаніі Tourane, на гэтым тыдні Тайланд узначаліў спіс самых бяспечных напрамкаў у свеце для наведвання падчас пандэміі. Каралеўства лічыцца самым бяспечным месцам для падарожжаў на падставе розных крытэрыяў. У Тайландзе ёсць сістэма своечасовага апавяшчэння аб новых выпадках заражэння COVID-19, заяўляе Еўрапейскі цэнтр прафілактыкі і кантролю захворванняў (ECDC). Таксама важным фактарам з'яўляецца нізкая шчыльнасць насельніцтва краіны. Працягласць светлавога дня для актыўнага адпачынку ў краіне — больш за 6 гадзін, а авіязносіны з еўрапейскімі дзяржавамі досыць хуткія. У Тайландзе зарэгістравана невялікая колькасць выпадкаў COVID-19, і па міжнароднай медыка-санітарнай ацэнцы ён атрымаў 85 балаў са ста.

Таксама ў ліпені Глабальны індэкс COVID-19 апублікаваў спіс краін з самым высокім індэксам аднаўлення ад COVID-19, дзе прысвоіў Тайланду 82,06 бала, змясціўшы каралеўства на вяршыню глабальнай дыяграмы ў якасці прыкладу найлепшых практык па барацьбе з пандэміяй.

Міжнародныя аэрапорты і межы Тайланда пакуль закрытыя для замежных турыстаў. Аднак турыстычны сектар краіны паступова аднаўляецца, і як толькі сітуацыя з COVID-19 ва ўсім свеце палепшыцца, падарожжы ў «краіну ўсмешак» для ўсіх катэгорый грамадзян зноў стануць даступныя.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

21 жніўня 2020 г. № 31 (567)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

ПАДТРЫМКА ЁСЦЬ!

КРЫХУ нетыповая прамая лінія адбылася ў Савеце Рэспублікі. Заяўнікі званілі да Наталлі КАЧАНАВАЙ са словамі падтрымкі дзеючага кіраўніка краіны, дзяржаўнага палітычнага курсу і нават прапановамі.

— Сёння прамая тэлефонная лінія асаблівая, — звярнула ўвагу спікер верхняй палаты парламента ў размове з журналістамі. — Бо нягледзячы на тое, што звычайна пераважаюць пытанні, якія датычацца работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, звязаныя з будаўніцтвам жылля, сёння, сапраўды, людзі казалі аб падтрымцы таго курсу, які праводзіцца ў нашай краіне, аб падтрымцы Прэзідэнта, перадавалі яму словы ўдзячнасці, было шмат добрых пажаданняў.

У прыватнасці, людзі казалі аб неабходнасці захаваць мір і спакой, незалежнасць краіны.

— Гэта сведчыць аб тым, што народ разумее ўсё тое, што адбываецца сёння ў нашых гарадах, на нашых вуліцах. І народ ужо хоча міру і спакою, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Таму, я думаю, тая неабыякавая пазіцыя нашых грамадзян, што патэлефанавалі сёння, — вельмі каштоўная, і гэта меркаванне тых людзей, якія жадаюць захаваць мір, спакой і стабільнасць на нашай роднай зямлі, у нашай роднай краіне.

Усе гэтыя словы ўдзячнасці, пажаданні, што прагучалі ад жыхароў Беларусі з розных яе куткоў, Наталля Качанава паабяцала перадаць кіраўніку краіны.

Што датычыцца прапаноў, людзі агучвалі ідэі па наладжванні эфектыўнага камунікату з маладзёжным асяродкам: Галіна Васілеўна з Рэчыцы, якая прарабіла ў мясцовым судзе шмат гадоў, чалавек з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, напрыклад, гатова весці размову з моладдзю на любым узроўні.

Наталля Качанава падзякавала жанчыне за неабыякавасць і паабяцала задзейнічаць яе патэнцыял у гэтым кірунку.

Гаспадыня аграсядзібы «Белая Русь» Наталля Іванаўна з Бярозаўскага раёна, што на Брэстчыне, прапануе аддаць больш увагі моладзі, якая не задзейнічана ў працоўным працэсе. Яе ідэя — стварэнне маладзёжнай вёскі. Жанчына ўпэўнена, што маладыя людзі з задавальненнем адгукнуцца на такую прапанову. Спікер верхняй палаты парламента падзякавала гаспадыні аграсядзібы за актыўнасць і дала даручэнне старшыні Брэсцкага Савета дэпутатаў Юрыю Наркевічу асабіста азнаёміцца з дзейнасцю гаспадаркі і магчымасцю рэалізацыі маладзёжнай ідэі.

Безумоўна, падчас прамой лініі гучалі і іншыя (скажам так, традыцыйныя) тэмы.

Андрэя Пятровіча з Асіповіч хвалюе канфліктная сітуацыя, якая ўзнікла з суседам і датычыцца пабудовы на сумежным участку.

А Аляксандру Аляксандраўну, уладальніцу вясковай хаты ў Смаргонскім раёне, што на Гродзеншчыне, якая выкарыстоўвае яе як лецішча, хвалюе адсутнасць электрычнасці: хата стаіць асобна і правесці лінію самастойна каштуе немалых грошай. Жыхарку Рэчыцы Ірыну Уладзіміраўну турбуе вада, што пасля дажджу падмывае яе ўчастак. Скасаванне групы інваліднасці непакоіць мінчанку Марыю Міхайлаўну. У жыхаркі Бабруйска Кацярыны Кавалёвай таксама ўзніклі пытанні да сферы аховы здароўя, бо яе муж Сяргей, які страціў нагу, мае трэцюю рабочую групу і, як вынік, скарочаны на дзве гадзіны рабочы дзень. Жанчына сцвярджае, што яе сужэнец не ў стане выконваць працоўныя нормы. Па ўсіх агучаных заяўнікамі фактах, безумоўна, дадзены адпаведныя даручэнні, а па выніках іх разгляду яны будуць праінфармаваныя.

Вольга АНУФРЫЕВА, фота БелТА.

МЕРКАВАННЕ

Паразуменне ў грамадстве не страчана

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ.

«МС»: — Відавочна, што краіна апынулася ў складанай сацыяльна-палітычнай сітуацыі. Як на ваш погляд, ужо пройдзена яе вострая фаза? Якія новыя захады, падыходы і крокі варта распачаць, у тым ліку і мясцовым уладам разам з парламентарыямі, каб знайсці шляхі ўзаемапаразумення ў беларускім грамадстве ў новых умовах?

— Не падтрымліваю меркавання аб палітычным крызісе ў краіне. Асобнымі ўнутранымі сіламі пры актыўнай фінансавай і арганізацыйна-лагістычнай падтрымцы звонку робіцца спроба навязаць нам гэты крызіс і ажыццявіць неканстытуцыйную змену дзяржаўнай улады з-за іх паразы на выбарах. Але гэтым задумам не наканавана спраўдзіцца. І вось чаму.

Выбары прайшлі, яны адбыліся, атрыманы станоўчыя заключэнні міжнародных назіральнікаў ад СНД. Зацверджаны іх вынікі. Кіраўнік дзяржавы атрымаў

пераканаўчую перамогу (у Амерыцы сказалі б «лэндслайд» — вялікую перамогу). Думаю, што арганізаваныя або падтрыманыя (былі такія заклікі) альтэрнатыўнымі кандыдатамі масавыя беспарадкі пралілі святло на сапраўдныя мэты апазіцыі — прыйсці да ўлады любымі шляхамі, у тым ліку праз гвалт. Людзі гэта ўбачаць і ў гэтым разбяруцца.

Не хачу разважаць, як вы прапануеце, аб фазах цяперашняй сітуацыі. Сцэнарыі і фазы хутчэй існуюць у арганізатараў гэтых правакацый, якія б'юць у самае святое — адзінства і добрае стаўленне беларусаў адно да аднаго. Гэта самае складанае ў дадзенай сітуацыі. Арганізатары супрацьстаяння змяняюць тактыку, як далёка іх можа завесці лінія на стымуляванне беспарадкаў і непадпарадкавання закону — пабачым. Шлях запалохвання людзей, подкупу моладзі, які выкарыстоўваецца гэтымі сіламі, у Беларусі не спрацуе. Гэтым апазіцыйныя сілы толькі дыскрэдытуюць сябе ў вачах асноўнай масы грамадзян.

Усе дзяржаўныя інстытуты краіны функцыянуюць і выконваюць свае задачы. Кіраўнік дзяржавы ў сваіх выступах выразна расставіў усе акцэнты і пазначыў кірункі выхаду з сітуацыі, якая склалася — мы будзем працаваць, рабіць справу і рэалізоўваць намечаныя планы эканамічнага і сацыяльнага развіцця. Будзе працягвацца работа па ўдасканаленні палітычнай сістэмы краіны, канчатковая мэта якой — прыняцце змяненняў у Канстытуцыю.

У гэтай сітуацыя вялікая адказнасць кладзецца на парламентарыяў і мясцовыя органы ўлады. Наш грамадзянскі абавязак — падтрымаць лідара краіны самаадданай працай на сваіх рабочых месцах, аказаць дапамогу сялянам ва ўборцы ўраджаю, педагогам, на якіх аказваюць асаблівы ціск альтэрнатыўшчыкі, — паспяхова пачаць новы навучальны год у школах, рабочым — правільна сарыентавацца ў абстаноўцы і не пайсці на поваду ў правакатараў і падбухторшчыкаў, а працягваць выходзіць на работу, моладзі — паказаць перспектыву для іх развіцця і самарэалізацыі, супрацоўнікам праваахоўных органаў — у падтрыманні грамадскага парадку, а таксама іх маральна-псіхалагічнага стану.

Упэўнены, што паразуменне ў беларускім грамадстве не страчана, па ім нанесены пэўны ўдар тымі, хто не хоча бачыць на карце свету самастойную незалежную і суверэнную дзяржаву — Рэспубліку Беларусь. Праз вяртанне спакою і разважлівасці, удзел у высокапрадукцыйнай працы, паважлівыя зносіны і давер, выкананне законаў будуць адноўлены ранейшы гарманічны духоўны стан нашага грамадства і згода яго розных сацыяльных груп.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Са святам, Індыя

Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава павіншавала з нацыянальным святам Рэспублікі Індыя — Днём Незалежнасці — віцэ-прэзідэнта Індыі, спікера Радж Сабха Сансада гэтай краіны Мупаварапа Венкая Знайду і спікера Лок Сабха Сансада Індыі Ом Бірла.

Наталля Качанава падкрэсліла, што адносіны паміж краінамі развіваюцца ў атмасферы ўзаемаразумення і даверу, з'яўляюцца надзейнай асновай для рэалізацыі вялікага патэнцыялу двухбаковага супрацоўніцтва.

Старшыня Савета Рэспублікі зазначыла, што далейшае пашырэнне канструктыўнага міжпарламенцкага дыялогу дазволіць умацаваць міждзяржаўныя сувязі і пашырыць узаемавыгаднае партнёрства ва ўсіх сферах дзейнасці.

Заўсёды абапіраццца на законы

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар Лісковіч правёў асабісты прыём грамадзян.

Людзей пераважна хвалявалі розныя жыццёвыя тэмы: пытанні залічэння ў школу, падрыхтоўкі дысертацыйных даследаванняў, работы банкаматаў і іншыя. Заяўнікі атрымалі парады і тлумачэнні.

Паводле слоў Віктара Лісковіча, сенатары на сістэмнай аснове працягваюць работу па ўсіх кірунках сваёй дзейнасці, у тым ліку са зваротамі грамадзян. Нягледзячы на часовыя цяжкасці, мы павінны жыць, думаць, як развіваць нашу краіну, што рабіць далей — заўтра, паслязаўтра. У гэтай дзейнасці важна заўсёды абапірацца на закон. Датычыцца тое як кожнага грамадзяніна, так і грамадства ў цэлым, звярнуў увагу старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі.

Дапамога бізнесу

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец у фармаце відэаканферэнцыі ўзяла ўдзел у рабоце Міжведамаснай камісіі па вызваленні юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў ад адміністрацыйных спагнанняў і платы пеняў.

У пасяджэнні камісіі таксама ўдзельнічалі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, прадстаўнікі Міністэрства па падатках і зборах, Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, Камітэта дзяржкантролю, Генеральнай пракуратуры, Дзяржаўнага мытнага камітэта, Нацыянальнага статыстычнага камітэта, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Члены Міжведамаснай камісіі разгледзелі хадайніцтвы і матэрыялы спраў суб'ектаў гаспадарання, якія звярнуліся па вызваленне ад адміністрацыйных спагнанняў і (або) выплаты пені. Па кожным звароце прыняты станоўчыя рашэнні ў задавальненні хадайніцтва цалкам або часткова.

Я ДУМАЮ ТАК

Мы непадзельны беларускі народ

Дзмітрый ВАРАНЮК, першы сакратар ЦК грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі», член Савета Рэспублікі:

— Сябры, мы непадзельны беларускі народ, які хоча бачыць краіну шчаслівай!

Беларуская моладзь сёння працуе ў студэнцкіх атрадах, будуе бальніцы і школы, выходзіць на вуліцы на акцыі салідарнасці, збірае ўраджаі, аказвае валанцёрскую дапамогу, якая патрабуецца, і рыхтуе партфелі першакласнікам.

Беларуская моладзь розная. Гэта ніяк не паўплывае на згуртаванне, гэта, наадварот, добра, што мы думаем кожны па-свойму! Мы разам можам будаваць нашу Беларусь і рухацца да перамен, але цывілізаваным шляхам.

Прэзідэнт сказаў аб новай Канстытуцыі, давайце будзем абмяркоўваць і прапаноўваць свае думкі.

БРСМ — за канструктыўны дыялог, за мір, за Беларусь!

Патрэбна адзінства

Алег ДЗЯЧЭНКА, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання ад Магілёўскай вобласці:

— Выбары адбыліся, і людзі ўжо вызначыліся, хто павінен кіраваць краінай. Зараз усім нам неабходна працаваць далей, каб развіваць вытворчасць, нарошчваць аб'ёмы экспартных прадукцыі, у спакойнай абстаноўцы завяршыць уборку ўраджаю, падрыхтавацца да пачатку новага навучальнага года, не дапусціць успышкі другой хвалі каранавіруса. Адным словам, аператыўна вырашаць жыццёвыя для нашага народа задачы. Дзеля гэтага ўсім удзельнікам палітычнага працэсу трэба супакоіцца, спыніць спрэчкі і на аснове агульнанацыянальных інтарэсаў працягнуць сумесную работу па ўмацаванні дзяржаўнасці, незалежнасці, абароне тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі. Гэта сёння галоўнае.

Беларускаму народу як ніколі раней патрэбна палітычнае, ідэалагічнае і рэлігійнае адзінства. Трэба ўлічваць інтарэсы і тых, хто сёння прытрымліваецца іншай думкі наконт далейшага дзяржаўнага будаўніцтва. Неабходна дамаўляцца па спрэчных пытаннях. Будзем памятаць, што толькі ва ўмовах грамадзянскага міру і згоды мы зможам пераадолець тыя праблемы, якія існуюць у нашай краіне.

СВОЙ СЯРОД СВАІХ

ДВОЙЧЫ... СТАРАСТА

Віталь РАПЕЙКА — патомны кругавец. У Вялікіх Круговічах Ганцавіцкага раёна жылі і яго дзед і бацька

— Бацька, Генадзь Браніслававіч, спачатку працаваў кіроўцам у меліярацыйнай арганізацыі, — апавядае Віталь. — Потым перайшоў на цагельны завод. Я, можна сказаць, і вырас на гэтым прадпрыемстве. Мяне нават жартам называлі «сынам завода». Вельмі падабалася прыходзіць да бацькі, назіраць за тым, як выраблялася цэгла, ездзіць на пагрузчыку. Я і кіраваць ім навучыўся!

Менавіта з таго часу хлопец пацягнуўся да тэхнікі. Аўтамабілі, трактары, камбайны — гэта быў яго свет. Таму, скончыўшы вялікакруговіцкую дзесяцігодку, доўга не раздумваў, куды пайсці вучыцца далей. Паступіў у Ганцавіцкае прафтэхвучылішча на трактарыста і, дарэчы, быў адным з лепшых, да таго ж старастам групы. Напэўна, лёс яму такі наканаваны — быць старастам.

Атрымаўшы дыплом, Віталь вярнуўся ў родную вёску. Аж тры дні адпрацаваў слесарам у майстэрні калгаса «Сцяг Леніна» (так тады называлася сельгаспрадпрыемства), потым атрымаў трактар. Не першай маладосці той быў, даводзілася самому чыніць-рамантаваць. Ды ён бы сваю тэхніку нікому і не даверыў.

— Я і сёння такога прынцыпу прытрымліваюся, — усміхаецца Віталь. — Калі хочаш быць упэўнены ў машыне — даглядай яе сам.

Далей — служба ў арміі, потым зноў родны калгас. Праз пяць гадоў у спадзяванні на лепшыя заробкі перайшоў у ганцавіцкі аўтапарк. Але цягнула ў вёску, у поле. Вярнуўся ў калгас — і адразу на трактар. Араў, сеяў, убіраў... Калі пачаліся перабоі з зарплатай, ізноў сышоў, ізноў вярнуўся — шукаў сябе. «Знайшоў» жа ў Ганцавіцкім бюро тэхнічнай інвентарызацыі, дзе апошнія сем гадоў і працуе кіроўцам.

«Бягун» — можа сказаць іранічны чытач. Ды не. Не ў пошуках лёгкага жыцця пераходзіў ён з адной работы на другую. Проста чалавек Віталь такі — прынцыповы і бескампрамісны. Калі што не па ім — пад чужую дудку плясаць не будзе.

Менавіта за гэтыя якасці «пасаду» старасты вёскі Вялікія Круговічы прапанавалі яму.

— Як гэта атрымалася? — Рапейка і сам да сённяшняга дня здзіўляецца. — Старастай нашай вёскі доўгі час была дырэктар клуба Ванда Чабатарэнка. Аднойчы, два гады таму, яна зайшла надвячоркам да мяне і прапанавала замяніць яе на пасадзе старасты вёскі. Я нават разгубіўся: «А як жа вы?» Яна растлумачыла, што мяняе месца жыхарства.

Кандыдатуру Віталя Рапейкі падтрымалі і аднавяскоўцы, і сельвыканкам.

Да абавязкаў старасты вёскі Віталь Генадзевіч паставіўся так, як і да іншых даручэнняў: сур'ёзна і з поўнай адказнасцю.

— Не магу я людзей падводзіць, гэта ж мае аднавяскоўцы, — кажа ён. — Таму стараюся рабіць усё так, каб не сорамна было ім у вочы глядзець.

У старасты абавязкаў шмат: і парадак трэба ў вёсцы падтрымліваць, і са скаргамі жыхароў разбірацца. Але найбольш падабаецца Віталю арганізоўваць суботнікі, асабліва па добраўпарадкаванні вёскі, могілак. На могілках нядаўна з ініцыятывы Рапейкі правялі некалькі суботнікаў, прыбралі некалькі старых небяспечных дрэў. Цяпер тут амаль ідэальны парадак.

— Засталіся толькі дрэвы, якія мы самі не ў стане спілаваць, — тлумачыць ён. — Будзем збіраць грошы і выклікаць альпіністаў-прафесіяналаў.

Прыкладаў актыўнасці, ініцыятывы вясковага старасты шмат. Трэба было бачыць вочы Віталя Рапейкі, калі ён даведаўся, што ў Вялікіх Круговічах у 2019 годзе пройдуць раённыя «Дажынкі»! Чалавек радаваўся шчыра, адкрыта. А потым і сам актыўна ўдзельнічаў у падрыхтоўцы да раённага свята ўраджаю. «Стукаўся» да кіраўнікоў мясцовых прадпрыемстваў і арганізацый, індывідуальных прадпрымальнікаў, жыхароў вёскі, пераконваў навесці парадак на сваіх тэрыторыях, падворках, вуліцах, арганізоўваў суботнікі і сам шчыраваў на іх разам з усімі.

Рапейка — з тых людзей, пра якіх кажуць: яму да ўсяго ёсць справа. І сапраўды, не было і няма ў Вялікіх Круговічах такой справы, у якой бы не ўдзельнічаў староста. Папрацаваць на добраўпарадкаванні — ён у першых шэрагах. Дапамагчы школе падрыхтавацца да 150-гадовага юбілею — рыхтуе і ўстанаўлівае памятны знак. Арганізаваць прэм'ерны канцэрт самадзейных артыстаў — староста сярод актыўных памочнікаў і гледачоў. А калі ў 2019 годзе праходзілі выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, паўстала пытанне аб кандыдатуры старшыні ўчастковай выбарчай камісіі. Пасада хоць і грамадская, але вельмі адказная, і даверылі яе Віталю Генадзевічу.

Памятаю, як у 2018 годзе ў краіне рыхтавалі спецыяльную карту-схему прыродных крыніц. Віталь Рапейка і тут праявіў актыўнасць. Прыйшоў у рэдакцыю раённай газеты, расказаў пра задуму аб'ездзіць раён, сфатаграфаваць крыніцы, апісаць іх паходжанне і гісторыю, і папрасіў дапамогі. Ці ж можна адмовіць чалавеку, які звяртаецца з такой шчырай просьбай, заўважце, не ў асабістых інтарэсах, а дзеля грамадскай карысці. Некалькі дзён вечарамі мы ездзілі з Віталем на яго асабістым аўтамабілі па Ганцаўшчыне, каб нанесці на карту месцазнаходжанне тых крыніц. А могжа проста дома пабыць, з сям'ёй — ніхто ж не прымушаў траціць свой бензін і вольны час на работу.

Што характэрна, ініцыятыва старасты заўсёды знаходзіць падтрымку і дапамогу з боку кругаўцоў. Людзі яго паважаюць і заўсёды падтрымліваюць. А калі ўзнікаюць нейкія праблемы, ён звяртаецца да старшыні сельскага Савета Вольгі Бобка, з якой з першага дня наладзіліся добрыя стасункі, да кіраўнікоў мясцовых прадпрыемстваў і арганізацый, да індывідуальных прадпрымальнікаў. І заўсёды знаходзіць паразуменне і падтрымку.

У сельвыканкаме ацанілі стараннасць і ініцыятыўнасць Віталя Рапейкі і прапанавалі па сумяшчальніцтве яшчэ адну грамадскую пасаду — старасты вёскі Шашкі. Так што цяпер Віталь Генадзевіч — двойчы староста. І ў Шашках, і ў Вялікіх Круговічах. Спраў прыбавілася. Але Віталя Рапейку гэта не палохае. У яго шмат новых ідэй і задумак.

Вячаслаў БУРДЫКА.
Фота Алы ПЯТЛІЦКАЙ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. **Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 287 18 31;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 20 жніўня 2020 года.

Памылачка выйшла

КІНАЛЯПЫ З САВЕЦКІХ ФІЛЬМАЎ

Штогод кінакампаніі па ўсім свеце выпускаюць мноства фільмаў, цікавых і не вельмі, глыбокіх і прахадных. Але толькі самым любімым пільны глядач даруе агрэхі, недакладнасці і знойдзеныя ў стужках «ляпы». Прыгадаем толькі сем вядомых ляпаў з савецкай класікі, з-за якіх, зрэшты, гледачы не сталі любіць гэтыя стужкі меней.

«Сямнаццаць імгненняў вясны». У маі 1945-га Шцірліц вязе пастара Шлага да мяжы, а паралельна ў эпізодзе гучыць мелодыя песні «Allez venez! Milord, vous avez l'air d'un môme...» — якая ўпершыню была выкананая толькі ў 1959 годзе Эдзіт Піяф.

«Брыльянтавая рука». Падчас эпізоду «Бабе — кветкі, дзецям — марозіва» ў кадры спачатку два эскімо на палачцы і дзве ружы, а праз імгненне — марозіва ў вазачках, а кветак ужо тры.

«Вялікі перапынак». Ганжа абварыў кіпенем правую руку, а ў медпункце яму бінтуюць чамусьці левую, і ў далейшых сцэнах таксама бінт «мігрыруе» з рукі на руку.

«Джэнтльмены ўдачы». Татуіроўкі, якія давялося зрабіць Яўгену Лявонаву для ўжывання ў ролю крымінальнага аўтарытэта, то выцвітаюць, то робяцца больш яркімі, а ў адной са сцэн «наколка» з лямпачкай наогул перакульваецца дагары нагамі.

«Іронія лёсу, або З лёгкай парай!» Здаецца, толькі лянівы не помніць хоць пару цытат і кіналяпаў з шэдэўра Эльдара Разанава. Адзін з самых вядомых — фота Іпаліта. У серванце стаіць партрэт Юрыя Якаўлева, а са снегу гераіня паднімае картку Алега Басілашвілі, які і мусіў першапачаткова іграць у фільме.

«Д'Артаньян і тры мушкецёры». Амаль класічны недагляд касцюмера: калі ў дом Буанасье прыходзяць гвардзейцы, Д'Артаньян на другім паверсе ў адным боце — на левай назе, а спускаецца ўніз, каб вызваліць каханую — зноў у адным, але на правай...

Тыя ж і конь. А гэта не ляп, проста забаўны факт — бронзавая статуэтка Пегаса, якая захоўвалася ў рэквізітарскіх цэхах «Масфільма», настолькі падабалася рэжысёрам, што зрабіла кінакар'еру на зайздрасць многім акцёрам. Гэты конь «засвяціўся» ў фільмах «Службовы раман», «Брыльянтавая рука», «Сакрэтная місія», «Пакет», «Мой ласкавы і пяшчотны звер», «Шырлі-Мырлі».

Фота kino-teatr.ru.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 101

Сваю новую задачу прапануе Міхаіл Кошаль з Мінска *(гл. дыяграму)*.

Белыя: Крb4, Фd4, Се5, Кb6, пс4 (5).

Чорныя: Крс6, Сb8, пп. b7, d6 (4).

Мат за 2 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Хмяльніцкага, 10А, Мінск, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Адэскі гросмайстар і гісторык шахмат Сяргей Ткачэнка сабраў цікавыя звесткі пра шахматны матч, які адбыўся ў 1911–1913 гадах па перапісцы паміж чытачамі, з аднаго боку, газеты «Одесские новости», з другога — санкт-пецярбургскіх газет «Речь» і «Современное слово». Але падзел на «поўдзень» і «поўнач» тагачаснай Расійскай імперыі быў досыць умоўны. У склад кожнай каманды ўваходзіла па 100 гульцоў, асобныя з іх жылі ў Францыі, Бельгіі, Італіі, некаторыя — у Сібіры. Сярод удзельнікаў былі будучы чэмпіён свету Аляксандр Алехін (дарэчы, сваё прозвішча ён заўсёды пісаў і вымаўляў без літары «ё»), будучы віцэ-чэмпіён свету Яфім Багалюбаў, іншыя вядомыя майстры. З жыхароў Беларусі (у сучасных яе межах) у каманду «Поўдня» ўваходзілі Д. Я. Данюшэўскі (Мядзел), С. Н. Грэбельскі і А. Давідман (Магілёў) — кожны выйграў па 2 партыі. За «Поўнач» гулялі А. А. Касперскі і Ю. Ліберман (Мінск), С. Хвілівіцкі (Орша) — па 2 балы, А. Я. Герцык (Мінск) — 1, А. Н. Вялінскі і А. М. Каляда (Мінск) — па 0,5, Я. М. Сядашаў (Барысаў) — 0. Частка партый па розных прычынах не была своечасова завершана, таму вынікі прысуджаліся арганізатарамі зыходзячы з пазіцыі. Сяргей Ткачэнка прыводзіць доказы, што матч скончыўся ўнічыю з лікам 100:100.

У кнігах беларускага гісторыка шахмат В. Рубінчыка і іншых крыніцах ёсць звесткі пра некаторых удзельнікаў матча. Антон Антонавіч Касперскі (памёр у 1936 годзе) у савецкі час быў неаднаразовым чэмпіёнам Мінска, удзельнічаў у чэмпіянатах СССР 1925 і 1927 гадоў, вёў шахматныя рубрыкі ў выданнях «Савецкая Беларусь», «Акцябр» і «Рабочы». Давід Данюшэўскі (1885–1944) — удзельнік Усерасійскай алімпіяды 1920 года (якая лічыцца першым чэмпіянатам СССР), жыў на той момант у Ніжнім Ноўгарадзе. Аляксандр Мікалаевіч Каляда працаваў на чыгунцы, паспяхова гуляў у мінскіх гарадскіх турнірах. Якаў Мікіціч Сядашаў (1877–1938) рашаў задачы, гуляў па перапісцы, удзельнічаў у першынствах Мінска. Саламон Хвілівіцкі (1893–1950) пазней пераехаў з Оршы ў Ленінград, паспяхова змагаўся ў спаборніцтвах з шахматнымі майстрамі.

* * *

Беларускі гросмайстар Уладзіслаў Кавалёў заняў 10-е месца ў анлайн-турніры на сайце chess.com (745 удзельнікаў).

А дзве наступныя партыі былі згуляны нядаўна ў анлайн-турніры «Легенды шахмат».

Дзін Ліжэнь — Васіль Іванчук. 1. d4 Kf6 2. c4 e6 3. g3 c5 4. d5 ed 5. cd b5 6. e4 K:e4 7. Cg2 Kd6 8. Kf3 Ce7 9. 0-0 0-0 10. Cf4 Ka6 11. Ле1 Cb7 12. Кс3 b4 13. C:d6 C:d6 14. Ке4 Фс7 15. Kfg5 h6 16. Фh5 Се5 17. d6 Фb6 18. K:f7 Л:f7 19. Ф:е5 c4 20. Cf1 Лс8 21. Лас1 c3 22. bc Кс5 23. cb K:e4 24. Л:с8+ C:c8 25. Фе8+, 1:0.

Аніш Гіры — Петар Лека. 1. Kf3 Kf6 2. g3 c5 3. Cg2 Кс6 4. 0-0 e5 5. e4 d6 6. c3 K:e4 7. d4 f5 8. de de 9. Kbd2 K:d2 10. K:d2 Се6 11. Ле1 Фd7 12. Фа4 Cd5 13. C:d5 Ф:d5 14. Кс4 0-0-0 15. Cg5 Лd7 16. Лad1 Фе6 17. K:e5 Л:d1 18. Ф:d1 Ке7 19. Kd3 Фd6 20. Фе2 Kg6 21. Фе8+ Крс7 22. Kf4 Фd7 23. K:g6 Ф:е8 24. Л:е8 hg 25. Се7 C:e7 26. Л:h8 c4 27. Kpf1 b5 28. Kpe2 a5 29. Ле8 Cf6 30. Ле6 Крb7 31. Kpd2 a4 32. a3 Крс7 33. h4 Крb7 34. Крe3 Крс7 35. f3 b4 36. Л:f6, 1:0.

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1. Фh8! Першыя правільна адказалі Уладзімір Ізотаў, Васіль Барысевіч, Віктар Жук, Сяргей Цяльпук.

Вадзім ЖЫЛКО.

Сядзі і глядзі

У ЛЮСТЭРКУ КІНО

Кіно — тая прастора ў мастацтве, якая дазваляе цэламу калектыву творцаў не толькі паказаць сваё майстэрства, але і адлюстраваць стаўленне да падзей у гісторыі, грамадстве і падзяліцца ўласнымі разважаннямі на актуальныя асабіста для іх тэмы. На наступным тыдні гледачы «Беларусь 3» змогуць убачыць фільм-споведзь Андрэя Таркоўскага, біяграфічную драму пра Уладзіміра Высоцкага і дакументальны аповед пра палонных Вялікай Айчыннай вайны.

«Люстэрка» — кінастужка Андрэя Таркоўскага, якая выйшла ў 1974 годзе. У ёй гледачу прадстаўлена споведзь аднаго са знакавых кінарэжысёраў другой паловы XX стагоддзя. На экране, быццам у люстэрку, Таркоўскі дэманструе свае ўспаміны. Тут ёсць месца простым і складаным, важным і выпадковым падзеям, з якіх складаецца жыццё ва ўсёй яго непаўторнасці. На першы погляд здаецца, быццам успаміны разрозненыя, але потым разумееш: гэта рахунак чалавека самому сабе, дзе адзіны суддзя — сумленне. Будуючы свой аповед у двух вымярэннях на экране — паміж цяперашнім і мінулым, — рэжысёр дзеліцца з гледачамі сваімі роздумамі пра жыццё, дзе не абыходзіцца без непаразуменняў і пачуцця віны перад блізкімі людзьмі — маці і жонкай. Так, напрыклад, мы не толькі бачым Маргарыту Церахаву ў ролі маці героя, але знаёмімся і з мамай самога рэжысёра, чуем голас ягонага бацькі за кадрам, калі той чытае свае вершы. Такім чынам самае галоўнае, што заўсёды было ў душы рэжысёра, аб'ядноўваецца на экране. Ён, дарэчы, адзначаў, што ўсе сюжэтныя лініі карціны — аўтабіяграфічныя, і яму «хацелася расказаць пра свае пачуцці ў дачыненні да блізкіх людзей, а таксама пра незаменнае пачуццё доўгу перад імі»... Варта адзначыць, што гэтая кінастужка нават была адзначана Італьянскай кінаакадэміяй у 1980 годзе як «Найлепшы замежны фільм года». Паказ «Люстэрка» запланаваны на аўторак, 25 жніўня.

А вось на выхадных «Беларусь 3» пакажа біяграфічную драму Пятра Буслова **«Высоцкі. Дзякуй, што жывы».** Сюжэт пабудаваны на рэальных падзеях, якія ахопліваюць пяць дзён з жыцця легендарнага паэта, акцёра тэатра і кіно Уладзіміра Высоцкага. Усё Мікіту Высоцкаму, а ўвасобіў яго на экране Сяргей Бязрукаў. Падчас здымак і на працягу некалькіх месяцаў пасля выхаду кінастужкі імя выканаўцы галоўнай ролі трымалася ў сакрэце — нават калегі па цэху не ведалі, хто гэта. Паколькі стваральнікі фільма імкнуліся максімальна даставерна стварыць вобраз Высоцкага, то грым акцёра штодзённа займаў ад 4 да 6 гадзін, а маска-робат для твару рабілася на працягу паўгода.

У нядзелю 30 жніўня ўвазе гледачоў прапануюць дакументальны фільм Анатоля Алая **«Чорны воран»**, які ўбачыў свет на студыі «Беларусьфільма» ў 2017 годзе. Кінастужка, можна сказаць, з'яўляецца расследаваннем, у якім рэжысёр не толькі разглядае тэму ваеннапалонных у гады Другой

адбываецца летам 1979 года, калі ён знаходзіцца ў канцэртным туры ва Узбекістане. КДБ будуе змову, каб адным махам зруйнаваць кар'еру народнага любімца. Але час і лёс па-свойму распараджаюцца далейшым развіццём падзей... Першапачаткова праект фільма насіў назву «Чорны чалавек» і яго сцэнарыстам быў прызначаны Ігар Валошын, але ў выніку гэтая роля выпала сыну паэта сусветнай вайны, але і шукае адказы на асабістыя пытанні, якія звязаны з гісторыяй яго сям'і. Усё жыццё сын шукаў бацьку, а потым надзея яму ўсміхнулася, калі імя таго знайшлося ў архівах нямецкага аб'яднання «Саксонскія мемарыялы»... Працяг не прапусціце ў нядзельным эфіры на «Беларусь 3».

Алена ДРАПКО.
Фота kino-teatr.ru, ridus.ru.

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10 «Зона Х». Крымінальная хроніка (16+).
9.10 Галоўны эфір.
10.20 Навіны надвор'я.
10.40, 12.10, 18.35, 19.20 Меладрама «Замак з пяску» (16+).
13.05, 15.25 Меладрама «Даўгі сумлення» (16+).
15.15, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларуская часінка.
18.15, 1.00 «Зона Х». Крымінальныя навіны (12+).
21.00 Панарама.
21.50 Зразумелая палітыка.
22.00 Серыял «След» (16+).
0.40 Арэна.
1.20 Дзень спорту.

Беларусь 2

7.00 М/с «Шахеразада. Нерасказаная гісторыя» (6+).
7.30 М/с «Пінгвіны з Мадагаскара» (0+).
9.00, 19.35 Тэлебарометр.
9.05, 20.05 «Зразумець. Дараваць» (16+).
10.10 «Сямейныя гісторыі» (16+).
10.40 Камень, нажніцы, папера (16+).
11.15 «Да пабачэння» (16+).
12.00 Камедыя «Малы» (12+).
13.45 «ЖаннаПажані» (16+).
14.40 «Калі мы дома». Скетчкам (16+).
15.10 М/с «Стыч!» (6+)
15.50 Анімацыйны фільм «Захавальнік Месяца» (0+).
17.20 Прыгоды «Мсціўцы: эра Альтрона» (12+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНО.
21.20 «Тата папаў» (16+).
23.55 Серыял «Анатомія страсці» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня». Поліўка з рашчынай.
8.05, 12.00, 20.20 Навіны культуры.
8.25, 12.20 «Гэты дзень».
8.30 «Нацыянальны хіт-парад».
9.25 «Люблю і памятаю». Віктар Тарасаў.
10.05 «Рэстаран пана Сепціма». Маст. фільм (12+).
11.35 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
12.25 «Наперад у мінулае».
12.55 «Лепшае месца на свеце». М/ф (6+).
13.10 «Гусі-лебедзі», «Дзядуля і ўнучак». М/ф (0+).
13.45, 21.05 «Амерыканская дачка». Маст. фільм (12+) [СЦ].
15.25 «Навукаманія» (6+).
15.55, 22.55 «Нейтральныя воды». Маст. фільм (12+).
17.40 «Тэатр у дэталях». Спектакль Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі «Сіроўка».
18.05 Канцэрт «Славянскі базар — 2020».
19.40 «Апошні дзень». Аляксей Пятрэнка (12+).
20.40 «Калыханка» (0+).
22.40 «Архітэктура Беларусі» [СЦ].

Беларусь 5

6.55 Азбука спорту.
7.10, 18.00, 21.20, 23.00 Тэніс. WTA.
9.15 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд тура.
10.05 Лёгкая атлетыка. Брыльянтавая ліга.
12.10 Вялікі спорт.
12.55 Гандбол. Кубак Беларусі.
14.35 Біятлон. Кубак федэрацыі.
16.30 Кіберспорт. Аўтаспорт. W-серыя.
17.50 Спорт-цэнтр.
19.00 Хакей. Кубак Беларусі. «Нёман» — «Ліда». (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
22.00 На грані фолу. Футбольны агляд.

АНТ

6.00 Серыял «Два колеры страсці» (16+).
7.00 [СЦ], **8.00** [СЦ], **9.00** [СЦ], **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
7.05 «Беларусь. Здабытак Рэспублікі» (16+).
8.05 «Сам-насам з усімі» (16+).
9.10 «Контуры».
10.00 «Жыць здорава!» (16+).
11.10 Серыял «Два лёсы-3» (16+).
12.10 «Модны прыгавор» (6+).
13.10 Серыял «Прыгажуня» (16+).
15.10 «Давай пажэнімся!» (16+).
16.20 «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
17.20, 18.20 «На самай справе» (16+).
18.50 «Няхай гавораць» (16+).
20.00 Час.
21.10 «У сузор'і Стральца». Серыял (16+).
23.05 Серыял «Жыла-была адна баба» (16+).

СТБ

6.00, 6.40, 7.45 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
8.40 «Тыдзень».
10.00 Дак. праект (16+).
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.20 «Вадзіць па-руску» (16+).
12.40, 21.20 «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.05 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.35, 20.30 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.30 «Вадзіць па-руску» (16+).
